**УДК 392.34:37.035**

# САЦЫЯЛІЗІРУЮЧЫ І ПЕДАГАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТЭКСТАЎ, ПРЫЗНАЧАНЫХ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ (НА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ)

***канд. гіст. навук, дац. С.У. АНДРЫЕЎСКАЯ***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Разглядаюцца праблемы сацыялізацыі і выхавання дзяцей з дапамогай патэнцыялу тэкстаў беларускага фальклору. На аснове аналізу фактычнага матэрыялу, які быў сабраны на тэрыторыі Падзвіння ў канцы XIX – XX стагоддзяў, асветлены прынцыпы выхавання дзяцей у рамках традыцыйнай культуры на ідэалах дабра і справядлівасці.*

**Уводзіны**. Навукоўцамі яшчэ ў XX ст. сістэматызаваны назіранні аб законах і асаблівасцях развіцця дзяцей. Сярод іх вылучаны А.Н. Лявонцьевым закон, які сведчыць, што развіццё дзіцяці трэба разглядаць як засваенне грамадска-гістарычнага вопыта, у працэсе якога адбываецца фарміраванне псіхікі дзіцяці. Псіхолаг і педагог Д.Б. Элконін казаў аб фарміраванні ў дзіцяці “вобраза сябе” і “ўрастанні” ў структуру свядомасці дзіцяці бацькоўскага вобраза, вобраза дарослага і фарміраванні самасвядомаці і самаадзнакі [1, с. 67]. Фальклор з’яўляецца падмуркам, на якім мы можам пабудаваць нашы веды аб тым, як уяўлялі сябе нашы продкі, паводле якіх прынцыпаў і правілаў паводзінаў выхоўвалі дзяцей. Адначасова, вопыт продкаў здольны падказаць правільны накірунак выхавання для сучасных педагогаў і бацькоў. Агульнавядома, што для традыцыйнага грамадства не былі характэрны тыя цяжкасці ў сацыялізацыі і выхаванні дзяцей, з якімі сутыкаюцца сучасныя педагогі.

У глабалізаваным свеце сёння асабліва актуальным стала захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці. Захаваць яе і выхаваць у дзяцей можна толькі звяртаючыся да нацыянальнай мовы і народнай культуры, фальклорных тэкстаў свайго этнасу, іх лакальных асаблівасцей.

Беларускае Падзвінне – гэта рэгіён, у якім склаліся свае асаблівыя фальклорныя тэксты (у тым ліку і тэксты дзіцячага фальклору). Іх асаблівасці праяўляюцца ў моўнай спецыфіцы. Аб сюжэтнай, жанравай спецыфіцы Падзвіння ў дзіцячым фальклоры гаварыць цяжка, бо для культуры дзяцінства славянскіх народаў у цэлым характэрна ў гэтым сэнсе тыповасць. Што лагічна, бо дзяцінства з’яўляецца феноменам, уласцівым кожнаму грамадству.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца паказаць на прыкладзе тэкстаў, сабраных з тэрыторыі Падзвіння, сацыялізіруючы і педагагічны патэнцыял, які можна выкарыстаць ў сучасным выхаванні дзяцей.

У сувязі з мэтай вырашаюцца наступныя задачы: 1) раскрыць сутнасць сродкаў і прыёмаў стыхійнай народнай псіхалогіі, што скарыстаны ў фальклорных тэкстах; 2) паказаць на прыкладах з тэрыторыі Падзвіння, які вобраз чалавека фарміраваўся ў дзіцяці.

**Асноўная частка.** Ва ўмовах, калі сабрана шмат фактаў у навуках аб чалавеку, узнікае неабходнасць міждысцыплінарнага падыходу да праблем. Такой комплекснай праблемай з’яўляецца культура дзяцінства. Неабходнасць міждысцыплінарнага сінтэзу, з дапамогай якога магчыма стварыць цэласную карціну “дзіця ў культуры,” выказвалася многімі навукоўцамі. У апошняе дзесяцігоддзе сталі ўзнікаць спробы аб’яднаць веды аб дзяцінстве, узніклі новыя галіны гуманітарных ведаў. Разуменне дзяцінства як асаблівай псіхасацыяльнай катэгорыі, што не змяшчаецца ў межы адной навукі, выклікае з’яўленне прац па этнаграфіі дзяцінства, сацыялогіі дзяцінства, экалогіі дзяцінства, псіхалогіі дзяцінства, нарэшце, сацыяльнай псіхалогіі дзяцінства [2, с. 8].

Некалькі слоў аб выкарыстаных паняццях: сацыялізацыя і выхаванне. Агульнапрынятым з’яўляецца разуменне сацыялізацыі як працэса ўключэння дзіцяці ў грамадства, засваення ім сацыяльных роляў, правіл паводзінаў, культурных нормаў узаемадзеяння ў канкрэтным грамадстве. Свет ў гэтым выпадку ўяўляецца асобе як сістэма аформленых каштоўнасна-нарматыўных мадэляў паводзінаў. У працэсе сацыялізацыі вылучаюць два аспекты: усталяванне сістэмы сацыяльных роляў для кожнай асобы, станаўленне сітэмы яе асабістых культурных сэнсаў, другім аспектам з’яўляецца станаўленне сацыяльнай ідэнтычнасці асобы, перадумовай якой ёсць уключэнне дзіцяці ў розныя сацыяльным структуры (для традыцыйнага грамадства гэта, перш за ўсё, сям’я). Менавіта для характарыстыкі ўваходжання дзіцяці ў існуючую сістэму грамадскіх сувязей звычайна і выкарыстоўваюць паняцце сацыялізацыя [3, с. 27]. У літаратуры ёсць два падыходы да паняцця выхавання. У першым выпадку выхаванне разглядаецца як мэтанакіраваны працэс з боку выхавацеля (напрыклад, бацькі ці маці). У другім выпадку яно разумеецца як сукупнасць усіх, выпадковых і мэтанакіраваных уздзеянняў на дзіця. Відавочна, што калі разумець выхаванне ў шырокім сэнсе, яно не будзе адрозніваца па зместу ад сацыялізацыі [3, с. 29]. Доўгі час этнолагі не скарыстоўвалі паняцце сацыялізацыя, але ў апошнія дзесяцігоддзі, дзякуючы міжнавуковаму ўзаемадзеянню, гэты тэрмін пачаў шырока ўжывацца ў этналагічных працах [4; 5, с. 37; 6, с. 255]. У да-

Polotsk SU

дзеным артыкуле размова ідзе аб патэнцыяльных магчымасцях дзіцячага фальклору, якія можна скарыстаць ў сацыялізацыі сучасных дзяцей.

Прапануем прааналізаваць сацыялізуючы, педагагічны патэнцыял, які захоўваюць фальклорныя тэксты ў адносінах да дзіцяці. З'яўляючыся на свет, дзіця не адразу ўваходзіць у свет культуры, якая навокал. У этналагічнай навуцы дастаткова поўна прааналізаваны радзільныя абрады, мэтай якіх і з'яўляецца сімвалічнае ўключэнне дзіцяці ў свет людзей, культуру [7].

Тым не менш, пасля нараджэння, завяршэння радзільных і хрэсьбінных абрадаў, такое ўздзеянне працягваецца. Яно характарызуецца стыхійна сфарміраванымі, народнымі псіхалагічнымі ведамі аб асаблівасцях развіцця дзіцяці. Народныя практыкі пешчання скіраваны, каб дапамагчы дзіцяці ўсвядоміць сваю цялеснасць (дакрананні да ручак, ножак дзіцяці). Пры гэтым прыгаворваюцца забаўлянкі тыпу: "*Кую, кую ножку, паеду ў дарожку, ку-кую другую Ваню пацалую*" (Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобл.)[1].

Справа ў тым, што па меркаванні навукоўцаў-псіхолагаў, дзіця да пэўнага ўзросту (прыкладна да года) не адзяляе сябе ад навакольнага свету і істотным для яго з'яўляецца навучыцца адасабляць сябе ад асяроддзя. Невыпадкова ў народнай культуры гэты працэс кантраляваўся традыцыяй. Стагоддзямі перадаваліся з пакалення ў пакаленне тэксты мацярынскага фальклора, звернутыя да дзяцей. У іх зафіксаваны найбольш удалыя спосабы навучання дзіцяці разуменню ўласнага цела. Агульнавядомымі для беларускага этнаса з'яўляюцца пястушкі, пацешкі, пальчыкавыя гульні.

Дакранаючыся да дзіцяці, маці дэманструе "асабістыя межы" дзіцяці: "*А дзе Волены ручкі, а вось Волены ручкі!*", "*А дзе Ванявы ножкі? А вось Ванявы ножкі!*" (Міёрскі раён Віцебскай вобл.). Істотным з'яўляецца называць імя дзіцяці, дакранацца да цела, у выніку чаго, дзякуючы тактыльным адчуванням, дзіця і ўсведамляе "межы сябе". Некаторыя расійскія даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што па меры таго, як дзіця пачынае адчуваць, усведамляе, ведае, колькі ў яго рук, ног, вушэй, пальцаў, дзе нос, рот, вочы, у яго складаецца своеасаблівая "мапа ўласнага цела" [8 , с. 17]. Узгадайце, напрыклад, шырокараспаўсюджаныя на Падзвінні тэксты-гульні для дзяцей: *"А дзе ў Танечкі носік? А вось ён носік!"*; "*А дзе ў Вовачкі вочкі? Вось яны вочкі!*"; "*А дзе ў Андрэйкі вушкі? Вось яны, вушкі!*" (Полацкі раён, Віцебская вобл.). У беларускай этналагічнай навуцы некаторыя даследчыкі называюць сукупнасць такіх прыёмаў "школай мацярынскага пешчання" [4], "мацярынскай школай," "паэзіяй пеставання" [9].

Вербальнае ўздеянне суправаждалася фізічным кантактам, лёгкім масажам ножак, ручак немаўляці. Тым, што зараз педыятары рэкамендуюць як "гімнастыку для немаўлят", якая спрыяе фізічнаму і разумоваму развіцці дзіцяці. Прывядзем прыклад з запісаў Е.Р. Раманава: "*Сарока, варона / дзеткам кашу варыла, / На прыпечку студзіла. / Ентом дала, / Ентому дала, / А ентому (мізінец) не дала. / А ты мал, круп не драў, / Вады не насіў, / Дзяжы не мясіў. / Ідзі, малый, па вадзіцу, / Табе кашка на паліцы / У маленькай чарапіцы*" [10, с. 174].

Наступнай псіхалагічнай пазіцыяй, якая неабходна для выхавання паўнавартаснага чалавека, і з якой паспяхова спраўляецца народны фальклор, з'яўляецца фарміраванне "базавага даверу". Тэрмін "базавы давер" уведзены ў навуковую псіхалогію дзяцінства Э. Эрыксанам, які казаў, што "базавы давер фарміруюць маці ў сваіх дзяцей, дзякуючы такому стаўленню, якое, па-сутнасці, складаецца з турботы аб індывідуальных запатрабаваннях дзіцяці і адчування таго, што яна сама той чалавек, якому варта давяраць, у тым разуменні слова "давер," якое існуе ў дадзенай культуры… Дзякуючы гэтаму, у дзіцяці складаецца адчуванне, што "ўсё добра, маці побач", з'уляецца падмурак для таго, каб ён стаў тым, кім ён стане, згодна надзеям іншых людзей…" [11 , с. 207]. Гэтая ідэя назіраецца і ў традыцыйнай культуры беларусаў. Менавіта таму ў пястушках, калыханках, прыгаворах з тэрыторыі Падзвіння (трэба сказаць і з іншых тэрыторый Беларусі) імя дзіцяці назваецца пераважна ў памяншальна-ласкальнай форме: *"Ванечка," "Максімка," "Верачка," "Алечка."* Вось прыклад з запісаў на Віцебшчыне, зафіксаваных П. Шэйнам: "*Коў-коў дзяцел, / сеў на варотах/ у чырвоных ботах: / - Ці жыў Даніла? / -Ці жаніў сына? / - Ці атдаваў дочку? / - Кацярынушку? - / коў, коў, дзяцел, / сеў на варотах / у чырвоных ботах, / у красніськім колпачку / І шапочка на бочку / - А Мікітка, саколік! / -Ці варыў піва? / -Ці жаніў сына? / - Ці даваў дачку? / За Аначку?*" [12, с. 23]. Як трапна заўважаюць даследчыкі народнай педагогікі, яе сэнс ў тым, што чалавек першапачаткова быў скіраваны на ідэал добрага, дзе шчаслівая і радаснае жыццё звязана з дзейсным дабром у адносінах да іншага [13, с. 7]. Зразумела, гэта ідэалізаваная карціна жыцця сялян, але менавіта яна малюецца ў тэкстах, прызачаных для дзяцей.

Важным для дзіцяці з'ўлялася структураванне акаляючага асяроддзя і ўсведамленне свайго месца ў ім. Мацярынскі фальклор (перш за ўсё, калыханкі) скіраваны на выкананне гэтых функцый. Менавіта дарослыя ўводзяць дзіця ў свет матэрыяльнай і духоўнай культуры і роднай мовы, якімі прадстаўлены найважнейшыя прасторава-сэнсавыя каардынаты, што дапамагаюць дзіцяці арганізаваць і ўсвядоміць непасрэдны, у першую чаргу, цялесны асабісты вопыт [8 , с. 15].

[1] Тут і далей прыводзяцца сучасныя запісы, зробленыя аўтарам, на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.

Гэтым мэтам падпарадкавана калыханка. Калыханкі – адзін з жанраў фальклору, прызначаны выключна для дзяцей. Гэтыя кароткія песні выконвалі маці, бабулі, нянькі над калыскай дзіцяці ці носячы яго на руках. Даследчыкі вылучаюць утылітарную функцыю (закалыхаць), выхаваўчую (расказаць аб будове свету), эстэтычную (выхоўваецца музычны густ) [15, с. 5]. Калыханкі добра даследаваны мовазнаўцамі, фальклarystамі, музыказнаўцамі. Калыханкі – значны фальклорны пласт, які не абыйшлі ўвагай збіральнікі на Віцебшчыне. У кожным зборніку дзіцячага фальклору, менавіта калыханкам збіральнікі адводзяць значнае месца [15, с. 5].

Асаблівасцю будовы сюжэта калыханак з’яўляецца тое, што ў цэнтр свету ставіцца дзіця. Каб дзіця заснула, яму прапануюцца пачастункі (піражок, баранaчка), персанажы калыханак адсылаюцца “на таржок купіць дзіцяці піражок”, “пад масток, злавіць рыбку за хвасток” і г.д. [14 , с. 3]. Ва ўсялякім выпадку, відавочна, што дзіця (ці яго сон) – цэнтр будовы дзеяння і цэнтр сусвету. Цікавае даследаванне беларускіх калыханак ажыццявілі Р.М.Кавалёва, Т.В. Лук’янава, апісаўшы структурныя прынцыпы той карціны свету, якая малюецца ў калыханках [9, с. 38]. Даследчыцы прыходзяць да той жа думкі, што і аўтар артыкула, яны пазначаюць: “карціна свету ў мацярынскіх песнях сітэмнага тыпу з жорстка цэнтралізаванай структурай. Яе ядро складае двуадзіны вобраз – дзіця ў калысцы і маці, што співаючы яго люляе“ [9, с. 39]. Праз такія вобразы народная культура фарміруе ў дзіцяці адчуванне ўласнага “Я.” У псіхолага-педагагічнай тэрміналогіі – фарміруецца вобраз “станоўчага Я”.

Прывядзем у якасці прыклада калыханку з тэрыторыі Падзвіння: “*Баю-баюшкі баю, не лажыся на краю, прыдзе шэранькі ваўчок, ды ўкусіць за бачок.*” Расійскі псіхолаг М.У. Асорына лічыць, што для дзіцяці важным з’яўляецца паняцце “край” і як мяжа канкрэтнай прасторы (свая, асвоеная прастора – чужая), і як мяжы сімвалічнай [8, с. 21]. У беларускай этналагічнай навуцы ў трактоўцы фальклорных тэкстаў дарослых гэтае сімвалічнае паняцце распрацавана дастаткова добра.

Шырока тыражыруецца думка аб тым, што ў традыцыйным грамадстве не існавала адасобленай сферы дзяцінства, таму, маўляў, казаць аб спецыяльных прыёмах і метадах выхавання дзяцей – праца дарэмная. Аднак, у гэтым ёсць станоўчыя бакі: не існавала адносін да дзіцяці як да аб’екта выхавання і толькі. Дзіця ўносіла пасільны ўнёсак у матэрыяльны дабрабыт сям’і, раннія формы ўключэння яго ў працоўную дзейнасць здымалі пытанне суб’ектана-аб’ектных адносінаў, з якімі так змагаецца сучасная педагогіка, імкнучыся зрабіць дзіця не проста аб’ектам навучання, а пабудаваць адносіны паміж дарослымі і дзяцьмі па прынцыпу “суб’ект-суб’ект”.

Значнае месца ў фальклоры, прызначаным для дзяцей, надаецца гумару. Гэта розныя жартоўныя забаўлянкі, лічылкі, дражнілкі і г.д. Народны гумар, акрамя забаўляльнай функцыі, выконваў функцыю зняць напружанне пасля цяжкай працы, выконваў псіхатэрапеўтычную функцыю, у якой праяўлялася імкненне людзей рабіць добрае для іншых людзей. Гумар паказваў, што нават у цяжкай сітуацыі можа быць знойдзены выхад (у выглядзе неспадзяванага, незвычайнага рашэння), узнаўляў душэўныя сілы, раўнавагу дзіцяці, умацоўваў яго эмацыйны стан.

Вось прыклад гумарыстычнай гісторыі, запісанай на тэрыторыі Віцебшчыны, гімназістам, якая вельмі нагадвае ўсім нашым сучаснікам вядомую гісторыю “пра шэранькага козліка”: “*Быў у бабушкі козелка / Быў у бабушкі Мацейка, / Ён на стайне стаяў, / муку. Рожь поядаў / Муку сеянную / Рожу веянную / Зазоцелася казлу / у чісто поле погуляць / Свою сілу спробоваць / Як побег по ельнічку, / Побег по березнічку / сустрэў Мацейка / Шасць ваўкоў / А сёмы ваўчок / абарван бачок / - Мы з табой, козелька, / - мы з тобой, Мацейка / - побортаемся / - на лютым марозе пагрэеемся - / як узяў воўк казла за рогі, / як ударыў воўк казла аб дарогі, / Відь, свечі гораць / Аж у казла глаза глядзяць / Як узяў казла за хвост, / Як ударыў казла аб мост, / Як ўзяў казла за грыву, / Як ударыў казла аб ніву. / Як побег казелька / Як пабег Мацейка / Каля бабіна двара / Дзед дровы сячэць / Баба бліны пячэць / - Нутка, бабка, галубка, / - станем радня сабіраць / -Будзем казла пімінаць! / Козелка Мікітка, / А кошка – Сцепанідка, / Кароўка Маланка, / А бычок раманка, / Кабылка Марынка, / А жарабок Гаўрылка / Овечачка ганечка, / А баранька раманка, / А свінка Аксынка, / А парсючок Максімка, / Утка Лукутка, / А селязень Якутка, / курка Зофейка, /А пятушок – Мацвейка. / - Хто ў нас старшы? / -Хто ў нас большы?/ - Жораў у каптане / ястраб – дзесятнік, / Па сялу лятаіць, / курэй выглядаіць / Пы нямножку бырэць, / Пы десятку здярэць*” [12, с. 67]. Д.С. Ліхачоў адзначаў, што смех збліжае людзей, адначасова смеючыся над адным і тым жа, яны становяцца свойго рода “змоўцамі”, а той, з кім смяюцца ўсе, часцей становіцца пераможцам у спрэчцы. Мы бачым, што ідэал асобы-аптыміста, характэрны для народнай культуры і народнага светабачання, увасабляецца ў тэкстах, прызначаных для дзяцей, а, часам, і складзеных самімі дзецьмі [13, с. 15].

У культуры кожнага народа ёсць не заўсёды сфармуляваныя, але важныя пытанні аб тым, якая прырода і магчымасці чалавека, для чаго ён жыве, у чым бачыць шчасце, сэнс жыцця. Сэнс народнай педагогікі ў тым, што чалавек першапачаткова быў скіраваны на ідэал дабра. Гэта ўвасобілася ў казках, у тым ліку, і з тэрыторыі Падзвіння, дзе дабро заўсёды перамагае зло. Акрамя таго, у казках утрымліваецца ідэя, што падзеі, якія адбываюцца і носяць штодзённы характар (напрыклад, паўсядзённая праца), могуць быць на самой справе выпрабаваннем для чалавека. У выніку выпрабавання будзе ці ўзнагарода, ці пака-



Polotsk SU

ранне. З дапамогай такога сродку ў свядомасць укараняецца ідэя маральнага выбару. Дыялектыка выбару трансліруецца і ў падыходдзе да чалавека, як суб'екта свайго жыццёвага шляху (псіхолаг Альбуханава-Славінская лічыць, што толькі так можна зразумець чалавека). Нездарма этнолагі заўважылі, што калі размова заходзіць аб дзецях, метадах выхавання, рэспандэнты імкнуцца расказаць аб усім сваім жыцці. Падыход з пункту гледжання сацыялізацыйнага патэнцыялу вусных тэкстаў (казак, прымавак) заключаецца ў тым, каб навучыць дзіця пераважываць усе цяжкасці жыцця, нялёгкага сялянскага быта, адчуваць радасць жыцця, пераадолеўшы яго горкія моманты.

Аснову казачных сюжэтаў, як правіла, складае супрацьпастаўленне двух бакоў з рознымі жыццёвымі прынцыпамі, таму светлы, радасны фінал казкі, перамога станоўчага героя – гэта не толькі развязка, але і ідэйная "ўстаноўка" для падрастаючага пакалення.

Для прыкладу прывядзем некалькі казак, запісаных П.В. Шэйнам у Віцебскім павеце Віцебскай губерні в. Мадэліна. Казка №6 "*Як жыў дзед з бабой, мелі яны адну раду, елі хлеб з аўсом і білі адзін аднаго ў лоб каўшом. Жылі яны жылі, дажыліся – нечага есці, а карова ў іх была. Пайшоў дзед кароўцы даваць – найшоў бабіну ў саломцы, прынес, ды й кажыць: "На, бабка, звары гэту бабіну." А баба: "Я й гаршка ні падбыру,запашым мы яе лучшэ" … "Хіба запашым у лазні пад полам" Ну і запахалі. Бабіна тая ўзышла, расла, расла, падымаіць палок…*" Казка эклектычнага характару, акумулявала ў сабе сюжэты аб чароўнай бабіне, калабку, абмен паміж лісіцай, людзьмі, і звярамі (па тыпу рускай казкі "Лісічка са скалачкай"), пра бычка-трацячка набітага саломай, пра лісу і рыбака, воўк і ліса, як ліса мядзведзя абманула (запісана ад быўшай дваравой М.Ігн. Хмялеўскай) [12, с. 6–7]. Там жа ("пра дзедаву і бабіну дочак, якія жылі ў мядзведзя ў хацінцы") [12, с. 92-93]. Там жа "Дунька-калодка" (бабіна падчарыца), якая падобна да хаўрошачкі, мерыла чаравічкі (як у Золушкі), потым жаніх вызваляе нявесту (Дуньку запёрлі ў лазню). Для матчыхінай дачкі наступае неапраўдана жорсткая помста: "*Узялі, раздзелі сястру, скуру ёй садралі, на печ разаслалі, голову раздзёрлі, у вакно ўторкнулі, самі паехалі, зі ім садзік пайшоў і козлік пабег… Ідзець мачыха Дуньку рэзаць – схваціла скуру – а гэта яе дачка.*" [12, с. 97]. Такое апісанне жорсткага пакарання, верагодна, мае глыбокія міфалагічныя карані, але ж і мае сацыялізуючае значэнне: непазбежнасці жорсткага пакарання за злыя справы.

Уводзячы дзяцей ў даступнай і блізкай для іх форме (напрыклад, у казках) у бытавыя і сацыяльныя адносіны, народны фальклор ўводзіў іх у свет чалавечых узаемаадносін, дзе непазбежна сутыкаліся дабро і зло, праўда і няпраўда, любоў і нянавісць. Не адступаць перад цяжкасцямі, актыўна змагацца за дабро і справядлівасць – вось што раіць народная мудрасць дзяцям [13, с. 17]. Надзейным гарантам поспеху ў такой барацьбе з'яўляецца жыццё ва ўсіх яго праявах, аб чым сведчаць малыя жанры фальклорных тэкстаў ("Век жыві, век надзейся!" "Час міні, век – жыві!"), а таксама гэта праяўляецца ў большасці канцовак народных казак.

Дзіцячы фальклор выконвае значную сацыялізіруючую функцыю. У дражнілках, напрыклад, высмейваюцца неадэкватныя псіхічныя рэакцыі (слёзы, зазнайства, злосць): "*Плакса-вакса-гуталін, на насе гарачы блін!*". Адначасова трэніруюцца навыкі сацыяльнага ўзаемадзеяння, напрыклад, у адгаворках: "*Хто абзываецца, сам так называецца.*"

У дзіцячым фальклоры комплексна вырашаецца шэраг пытанняў: уменні падпарадкоўваць эмоцыі розуму, неабходнасць памятаць аб забаронах, развіццё памяці, развіццё хуткасці вербальных рэакцый – стымулявала жвавасць розуму [13, с. 32].

Рэалізацыя гуманістычнага (у сэнсе імкнення да жыцця) ідэйнага патэнцыялу становіцца магчымым пры асаблівых педагагічных умовах, якія эмпірычна склаліся ў народнай традыцыі. Сутнасці іх можна пазначыць, як аптымальнае суаднясенне знешніх уздеяннеў (нормы, эталоны, правілы сацыяльных паводзін) і ўнутранай псіхічнай структуры дзіцяці, абумоўленай яго псіхафізічнымі, індывідуальнымі і ўзроставымі асаблівасцямі развіцця. Пазначым ідэі, якія раскрываюць педагагічныя погляды народа адносна развіцця ў дзецях аптымізму і жыццярадаснасці:

а) жыццёсцвярджальная мэта ў народным выхванні;

б) адносіны да дзіцяці як да аб'екта і суб'екта сумеснай дзейнасці і выхавання;

в) арганізацыя радаснай ("светлай") перспектывы выхавання.

Мэта выхавання ў педагогіцы любога народа разумелася як выхаванне "паводле вобраза дасканалага чалавека" (па Г.Н. Волкаву), разглядалася не як далёкая перспектыва, а як кіраўніцтва для выканання. Аналіз сродкаў, якія выкарстаны ў фальклоры для дзяцей, дазваляе ахарактарызаваць якім бачыцца ідэальны вобраз дасканалай асобы. Так, з першых гадоў жыцця ў дзіцяці выхоўваюцца паважлівыя адносіны да слабых, старых, павага і спачувальнась [13, с. 18]. Разам з тым, у дзіцячым фальклоры рэалізавана запатрабаванасць дзіцяці ў любові і станоўчы эмацыйны вопыт, імкненне да стымулявання актыўнай дзейнасці.

У паняцце маральнага ідэалу ("вобраза дасканалага чалавека") ўкладваюцца наступныя якасці: чэснасць і праўдзівасць ("Хлеб-соль еш, а праўду рэж"), павага да людзей ("Шануй людзей, то і цябе пашануюць"), сумленнасць, сціпласць ("Слухай многа, а гавары мала," "Добрая слава даражэй за багацце"),



Polotsk.su

дабрыня (“Добрага добра і ўспамінаюць”), гонар і пачуццё ўласнай годнасці (“Беражы адзежу знову, а чэсць з моладу”). Адмоўнымі якасцямі ў беларусаў лічыліся: хітрасць, нядобрасумленнасць (“Сядзіць ціха, а думае ліха”), залішняя гаварлівасць (“Гаварыць гавары, ды меру знай”), безхарактарнасць, слабавольнасць (“Ні богу свечка, ні чорту качарга”), сквапнасць (“Снегу зімой не дапросішся”) і г.д. [16, с. 32–33; 17]. Рэгіянальныя асаблівасці ў канструяванні маральнага ідэалу вызначыць немагчыма. Таму можна сказаць, што беларусы Падзвіння вылучалі тыя ж станоўчыя і адмоўныя рысы ў чалавека, што і ў іншых рэгіёнах.

Г.Н. Волкаў [18] звяртае ўвагу на тое, што нават у такіх тэкстах, як галашэнні, прасочваецца клопат аб дзецях. Зразумела, дадзеныя тэксты належаць да культуры дарослых, аднак, як мы ведаем, дзеці не былі ізаляваны, удзельнічалі ў жыцці сям’і на роўных умовах з іншымі членамі. У кожным з галашэнняў абвязкова ўупамінаюцца дзеці (за выключэннем галашэнняў дзяцей па бацьках), што яшчэ раз паказвае вартасць, значнасць дзяцей для соцыума ў традыцыйнай культуры.

**Заключэнне**. Характэрны для народа спосаб аптымістычнага бачання свету атрымлівае сваё ўвасабленне ў выхаваўчым вопыце, традыцыях бацькоўскай педагогікі. Менавіта гэтая ўстаноўка – аптымістычнае ўспрыняцце жыцця і самога сябе ў жыцці – вызначае паводзіны дарослых у адносінах да дзяцей, таго як дарослыя адносяцца да дзяцей і якія метады ўздзеяння яны выкарыстоўваюць. Прыклады калыханак, прагавораў, якія выкарыстоўваліся ў развіваючых гульнях з дзецьмі (“матчына школа пешчання”) сведчаць аб правільных з пункуту гледжання сучаснай псіхалогіі і педагогікі падыходах да выхавання дзіцяці. У прыёмах пешчання зафіксаваны найбольш удалыя спосабы навучання дзіцяці разуменню ўласнага цела, адчуванню межаў “Я”.

Пазітыўная ўстаноўка закладзена ў шырокавыдомых выхаваўчых сродках: казках, пацешках, гульнях, песнях, загадках, дражнілках і г.д. Усе бакі народнага жыцця знайшлі ў іх сваё ўвасабленне, надавая веру ў перамогу справядлівасці і дабра.

У народной педагогіцы падкрэсліваецца самасць дзіцяці, што спрыяе станаўленню яго “Я.” У шматлікіх сродках народнай педагогікі задаюцца праграмы станоўчых паводзінаў, якія фарміруюць вобраз дзіцяці “Я – харошы” (станоўчы “Я-вобраз”). Напрыклад, аналізуючы казкі, даследчыкі адзначаюць, што характэрнай для казак з’яўляецца лінейная будова, якая стварае ланцужок адносінаў да адной асобы. Гэта дапамагае дзіцяці атаясамляць сябе са станоўчым героем, у якім сканцэнтраваліся ўсе найлепшыя якасці народнага характару.

ЛІТАРАТУРА


1. Эльконин, Д.Б. Детская психология : учеб. пособие для студентов высших учебных заведений / Д.Б. Эльконин. – 5-е изд., стер. – М. : Изд. центр Академия, 2008. – 384 с.
2. Абраменкова, В.В. Социальная психология детства: развитие отношений ребёнка в детской субкультуре / В.В. Абраменкова. – М. : МПСИВ Воронеж, МОДЭК, 2000. – 413 с.
3. Белинская, Е.П. Социальная психология личности / Е.П. Белинская. – М. : Аспект пресс, 2001. – 299 с.
4. Якубінская, А.Д. Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX стагоддзяў : аўтарэф. ... дыс. канд. гіст.навук : 07.00.07 / А.Д. Якубінская ; Беларускі дзяржаўны універсітэт. – Мінск, 2009. – 22 с.
5. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Мінск : Ураджай, 2000. – 111 с.
6. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л.В. Ракава. – Мінск : Беларуская навука, 2009. – 311 с.
7. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: кан. XIX – XX стст. / Т.І. Кухаронак – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.
8. Осорина, М.В. Секретный мир детей в пространсве мира взрослых / М.В. Осорина. – 5-е изд. – СПб. : Питер, 2013. – 368 с.
9. Кавалёва, Р.М. Жанравы код фальклорнай карціны свету: няказкавая проза. Дзіцячы фальклор. Загадкі. Казкі / Р.М. Кавалёва, Т.В. Лук’янава. – Мінск : Белпрынт, 2012. – 122 с.
10. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вильно : Б. м., 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.
11. Эриксон, Э.Г. Детство и общество / Э.Г. Эриксон ; пер. и науч. ред.: А.А. Алексеев. – 2-е изд., перераб. и доп. – СПб. : ИТД «Летний сад», 2000. – 415 с.
12. Шейн, П.В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями…/ П.В. Шейн. – СПб. : Типография Майкова, 1874. – 566 с.
13. Лунина, Г.В. Воспитание детей на традициях русской культуры / Г.В. Лунина – М. : ЦГЛ, 2005. – 128 с.
14. Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах: дапаможнік / склад. А.С. Емельянаў, Г.П. Харошка. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2007. – 200 с.
15. Дзіцячы фальклор: зборнік фальклорных матэрыялаў / рэд. кал.: У.А. Васілевіч (навук. рэд.) і інш. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.

16. Міхайлава, А.Л. Фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы кан. XIX – пач. XX стагоддзя : манаграфія / А.Л. Міхайлава. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2007. – 153 с.
17. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т.В. Валодзіна [і др.] ; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 439 с.
18. Волков, Г.Н. Педагогика любви. Избранные этнопедагогические сочинения : в 2 т. / Г.Н. Волков. – М. : Магистр-пресс, 2002. – Т.1. – 460 с.

## SOCIALIZING AND PEDAGOGICAL POTENTIAL OF FOLK TEXTS FOR CHILDREN (ON THE CONTENT OF BELARUSIAN DVINA REGION)

***S. ANDRYEWSKAJA***

*The article is devoted to the problems of socialization and education of children with the help of the potential of Belarusian folklore texts. On the basis of the analysis of factual material which was collected on the territory of the Dvina Region in the late XIX – XXth centuries, there are examples that reflect the principles of child-rearing within the traditional culture on the ideals of goodness and justice.*

*In the article are explored the main ideas of folk psychology and pedagogy which are embodied in lullabies, rhymes and other forms of folklore for children.*

*The article raises the question of the ethicizing of modern education.*

PolotskSU